Бог – Кароль майго жыцця

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
15.11.2015 01:00



Сёння сваю гісторыю распавядае сястра Вольга з Кангрэгацыі Сясцёр Найсвяцейшай Сям'і з Назарэта. Да Хрыста
праз міласэрнасць

Нарадзілася сястра Вольга ў Ваўкавыску ў сям'і бібліятэкара і электрамеханіка. Выхоўвалася разам з малодшым братам.

"У маёй сям'і заўсёды панавалі згода і дабрабыт. Мама выхоўвала ў нас пачуццё міласэрнасці. Вучыла думаць адно пра аднаго, заўважаць не толькі свае патрэбы. Мама сама паходзіць з вялікай сям'і, дзе была адной з 15 дзяцей. Таму прыклад такой адданасці яна прынесла са свайго «гнязда»".

У Крамяніцы ў касцёле святога Юрыя сястра Вольга прыняла першыя сакраманты: была ахрышчана і прыступіла да Першай святой Камуніі. *"Да сустрэчы з Хрыстом мяне рыхтаваў ксёндз Станіслаў Петраш. Назаўсёды застаўся ў памяці яго наказ: калі бачыш касцёл ці распяцце, абавязкова рабі знак крыжа. І да сёння гэтага прытрымліваюся"*

.

†

Сіла малітвы

Ва ўзросце 10 гадоў дзяўчынку паклалі ў шпіталь. Увечары, калі гасілі святло, яна, як і заўсёды, станавілася на калені і малілася.

 "Аднойчы гэта заўважыла манаская сястра і спытала ў мяне: ты верыш у Бога? Я трошкі спужалася, бо ў той час не магла свабодна вызнаваць веру. Але адважылася і адказала, што так. Мы разгаварыліся. Яна падарыла мне абразік са стацыямі Крыжовага шляху і паабяцала маліцца за мяне".

З 14 гадоў дзяўчына стала рэгулярна наведваць касцёл.

 "У школе я чула голас, які мяне клікаў. Была гатова штодня хадзіць у святыню, але пра кляштар і не думала".

Калі ў адзін цудоўны дзень катэхетка спытала яе, ці бачыць дзяўчына сваё пакліканне, то пачула ўпэўненае *"так, да сям'і".*

Хутка выпускніца здала экзамены і падала дакументы ў медінстытут. Але Бог распарадзіўся інакш: дзяўчына не паступіла і пачала рыхтавацца на наступны год.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
15.11.2015 01:00

Каля абраза Святой Сям'і

“Акурат у гэты час адзін клерык запрасіў моладзь, у ліку якой была і я, на свае аблучыны. Нас, дзяўчат, прынялі сёстры назарэтанкі. У той час яны яшчэ жылі ў семінарыі, дзе зараз знаходзіцца бібліятэка. Былі ветлівыя, запрасілі нас на вячэру. А пасля ўсе сабраліся ў каплічцы. Там я ўбачыла абраз Святой Сям'і і падумала: напэўна, гэта маё месца. Нават калі я не буду мець сваю сям'ю, змагу праз сваю ахвяру і малітву дапамагаць іншым сем'ям”.

Манахіні карэнным чынам змянілі ўяўленне дзяўчыны пра манаскае жыццё, і тая вырашыла застацца.

“Калі я сустрэлася з настаяцельніцай, яна радасна прывітала мяне: «О, сястра!». А я кажу: «Не, я толькі хачу паразмаўляць». Высветлілася, што яна зблытала мяне з пастуляткай. Але дадала: «Калі я цябе прыняла за сястру, то ты дакладна маеш пакліканне».

Дзяўчына прызналася, што Бог не дае ёй супакою і папрасіла настаяцельніцу памаліцца за яе. А калі вярнулася дадому, паведаміла бацькам, што ідзе ў кляштар.

“Вядома, мама пачала плакаць, перажываць. Але праз нейкі час змірылася і пачала маліцца, каб я вытрымала да канца”.

Божымі шляхамі

25 лістапада 1995 года ва ўспамін бласлаўлёнай Францішкі Седліскай дзяўчыну прынялі ў аспірат. А ў чацвер пасля Папяльцовай серады, 22 лютага 1996 года, – у пастулят. Летам распачаўся навіцыят. Праз два гады сястра склала першыя манаскія абяцанні, а 28 жніўня 2004 года – вечныя.

“Я паехала ў Чырвонаармейск ва Украіну працаваць катэхеткай. Нездарма адзін ксёндз сказаў, што першая пляцоўка, як першае каханне: ніколі не забываецца. І сапраўды, Украіна назаўсёды засталася ў маім сэрцы. І дагэтуль мне вельмі баліць за тое, што адбываецца там ў апошнія два гады. Існуе нават спакуса папрасіць у генеральнай сястры вярнуцца туды працаваць…”.

Пасля сястра Вольга паехала ў Навагрудак, а затым у Маладзечна. І панеслася: Калінінград, Гродна, Варшава, Шчучын, Мінск, Касцяневічы, Івянец, Ліда, Жытомір, Будслаў. Даводзілася выконваць розныя абавязкі: працаваць у катэхетычных пунктах і курыяльным магазіне, у закрыстыі і аплаткарні, на кухні і ў сталовай для бяздомных.

“Моцную духоўную сувязь з Маці Божай я перажыла ў Будславе. Шмат ласкаў яна выпрасіла ў Сына для мяне і маіх блізкіх, для людзей, якія прасілі аб малітве. На маіх вачах адбываліся шматлікія ацаленні і цуды. Працаваць у такім намоленым месцы было для мяне вялікім гонарам”. Сёння сястра Вольга служыць у закрыстыі ў пабернардынскім касцёле.

“Бог – гэта нешта найвышэйшае. Ён Той, хто варты глыбокай пашаны. Бог – Кароль майго жыцця. Ён заўсёды побач. Я нястомна дзякую за тое, што Ён вядзе мяне. «Калі я пайду далінай смяротнага цяню, не ўбаюся ліха, бо Ты са мною» (Пс 23)”.